**Малахава І.А.,** *ст.выкладчык*

# КУЛЬТУРАЛАГІЧНЫ АСПЕКТ ПАДРЫХТОЎКІ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ ДЛЯ СФЕРЫ МАСТАЦКАЙ ТВОРЧАСЦІ

Сучаснаму спецыялісту з вышэйшай адукацыяй неабходны не толькі пэўны ўзровень прафесійных уменняў і навыкаў, але і веданне ўзрастаючых патрабаванняў да развіцця творчага патэнцыялу кожнай асобы. Прафесійная кампетэнцыя маладога спецыяліста разглядаецца сёння праз прызму агульначалавечых каштоўнасцей і ўзровень рэалізацыі крэатыўнасці. Асабліва актуальны гэтыя праблемы ў кантэксце падрыхтоўкі спецыялістаў галіны культуры і мастацтва, паколькі спецыялісты павінны дасканала валодаць найноўшымі прафесійнымі тэхналогіямі, умець арыентавацца ў мностве накірункаў культуралагічнай навуковай думкі і практыкі, а таксама ўмець развіваць і рэалізоўваць свой творчы патэнцыял.

Культуралагічная падрыхтоўка спецыялістаў галіны культуры і мастацтва на сучасным этапе прадугледжвае не толькі глыбокія веды дысцыплін агульнафіласофскага і тэарэтычнага напрамкаў, але і дасканалае авалоданне спецыяльнымі дысцыплінамі і прафесійным мастацтвам. Дысцыпліны прыкладнога характару перш за ўсё дазваляюць студэнтам пазнаёміцца з новымі педагагічнымі тэхналогіямі і методыкамі, у аснове якіх ляжаць развіццё і рэалізацыя творчых якасцей асобы. Адной з такіх методык з'яўляецца прапанаваная намі тэхналогія стварэння музычнага спектакля ў дзіцячым асяроддзі, якая можа быць выкарыстана будучымі сацыяльнымі педагогамі, кіраўнікамі дзіцячых гуртоў, аматарскіх аб'яднанняў і іншымі спецыялістамі па рабоце з дзецьмі і падлеткамі.

Сярод розных відаў мастацтва асобнае месца, на наш погляд, займае музычны тэатр, дзе музыка і тэатр спалучыліся ў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адзіны арганізм і стварылі магутны сродак развіцця творчых якасцей асобы. Тэатр — мастацтва сінтэтычнае, а ў музычным тэатры дыяпазон узаемадзеяння розных відаў мастацтва значна пашыраецца ў бок пераважна музычнага ўздзеяння. Значыць, музычны тэатр валодае універсальнымі выхаваўчымі магчымасцямі, далучаючы дзіця адразу да некалькіх відаў мастацкай дзейнасці і гэтым садзейнічае эфектыўнаму развіццю крэатыўнасці асобы. Прымаючы ўдзел у падрыхтоўцы і стварэнні музычнага спектакля, падлеткі атрымліваюць магчымасць праяўляць і развіваць свае прыродныя творчыя здольнасці, якія потым могуць быць перанесены на іншыя віды дзейнасці, а таксама своечасова знайсці цікавую сферу творчай накіраванасці асобы і стымуляваць яе развіццё ў жаданым накірунку.

Такім чынам, эфектыўнымі сродкамі развіцця крэатыўнасці падлеткаў могуць служыць вялікі выхаваўчы патэнцыял мастацтва з яго поліфункцыянальнай сутнасцю і мастацкая дзейнасць. Апошняя ажыццяўляецца ў трох накірунках: успрыманне мастацтва, атрыманне ведаў аб мастацтве і непасрэдна мастацкая творчасць. Найбольш эфектыўным сродкам развіцця творчых якасцей у падлеткавым узросце з'яўляецца музычны тэатр за кошт сваёй сінтэтычнасці, сінкрэтычнасці, гульнявой прыроды дзейнасці. Неабходнасць развіцця творчых якасцей асобы менавіта ў падлеткавым узросце абумоўлена перш за ўсё кардынальнымі зменамі ў псіхафізіялогіі і сацыяльным статусе падлеткаў, а таксама асаблівасцямі навучальнай дзейнасці, накіраванай на рэпрадуцыраванне ведаў, а не на стварэнне новых сістэм сувязей. А мастацкая дзейнасць у гэтым узросце ў самых розных яе відах дазваляе пераарыентавацца на развіццё творчых здольнасцей. Таму падлеткавы ўзрост патрэбна разглядаць як сензітыўны перыяд развіцця крэатыўнасці асобы.

Значыць, паспяховасць развіцця творчых якасцей асобы залежыць ад мноства фактараў, сярод іх:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

а) узроставы паказчык (дзяцінства, маленства і інш.);

б) сродкі развіцця (розныя віды мастацтва, матэматыка, тэхніка і інш.);

в) метады развіцця і методыкі (пэўныя дзеянні, накіраваныя на дасягненне мэты).

Прычым на вызначаных узроставых этапах уздзеянне розных сродкаў развіцця творчых якасцей неаднолькава эфектыўна па прычыне сензітыўнасці ўзросту. Так, можна лічыць падлеткавы ўзрост сензітыўным перыядам у развіцці крэатыўнасці асобы сродкамі музычнага тэатра.

Усё гэта сведчыць аб тым, што ўспрыманне мастацтва, вывучэнне асаблівасцей яго ўздзеяння, актыўная творчая дзейнасць ва ўсіх яго жанрах ствараюць магчымасць інтэнсіфікацыі крэатыўных працэсаў чалавека. Асабліва актуальным і эфектыўным такое ўздзеянне мастацтва на асобу менавіта ў падлеткавым узросце, які з'яўляецца сензітыўным перыядам у развіцці творчых якасцей. А паколькі ў падлеткавым узросце разам з развіццём рэфлексіі ў рацыянальнай і эмацыянальнай сферах усё большае значэнне набывае эмацыянальны трэнінг, а само эмацыянальнае развіццё характарызуецца рухам у розных накірунках, то відавочна неабходнасць распрацоўкі і выкарыстання спецыяльнай развіццёвай методыкі. Такая методыка пакладзена ў аснову тэхналагічнай мадэлі творчасці, ці тэхналогіі творчасці, якая складаецца з двух асноўных кампанентаў: творчага прадукта і творчага працэсу, кожны з якіх, у сваю чаргу, складаецца з некалькіх элементаў.

Так, творчы прадукт уяўляе сабой вынік прадуктыўнай дзейнасці асобы і характарызуецца з пункту гледжання якасці, колькасці і сацыяльнай значнасці выніку творчасці. У якасці творчага прадукта могуць выступаць як вынікі работы розуму (думкі, ідэі, лагічныя структуры і інш.), так і вынікі практычнай дзейнасці асобы, увасобленыя ў матэрыяльнае (творы мастацтва, культуры і інш.). Творчы працэс уключае ўзроўні (этапы)



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

творчай дзейнасці асобы. Гэта пытанне знайшло неадназначнае тлумачэнне ў даследаваннях розных аўтараў. Мы прытрымліваемся тэорыі чатырохузроўневай трактоўкі этапаў творчай дзейнасці: першы ўзровень — падрыхтоўка; другі ўзровень — выспяванне; трэці ўзровень — натхненне; чацвёрты ўзровень — развіццё і праверка. Такім чынам, творчы працэс, падзелены на этапы, аб'ектыўна прадугледжвае паслядоўны ўдзел свядомых і несвядомых элементаў псіхікі ў дзейнасці па стварэнню сацыяльна каштоўнага і асобасна значнага творчага прадукта.

Сістэма развіцця творчых якасцей падлеткаў, ці тэхналогія творчай дзейнасці, прапанаваная намі, мае строга вызначаную структуру. Яна можа быць ужыта не толькі на дадзеным канкрэтным матэрыяле, таму што гэта методыка ў агульным выглядзе ўяўляе сабой сукупнасць неабходных дзеянняў для вырашэння пастаўленай праблемы — развіццё крэатыўнасці асобы ў працэсе мастацкай дзейнасці. А матэрыялам для гэтага можа служыць працэс стварэння любога музычнага спектакля.

Пры гэтым выкарыстанне канкрэтнага сродку развіцця вядзе да дасягнення пастаўленай мэты толькі ў строга адзначаным кантэксце, г.зн. калі будуць улічаны ўмовы, матывы, вызначана паслядоўнасць дзейнасці, апісаны этапы работы і педагагічны інструментарый. Значыць, з упэўненасцю можна гаварыць аб стварэнні нейкай пэўнай сістэмы ці методыкі, якая ў нашай інтэрпрэтацыі атрымала назву алгарытм развіцця творчых якасцей асобы. Тэрмін матэматычнай логікі «алгарытм» абазначае дакладнае прадпісанне аб выкананні ў азначанай паслядоўнасці дзеянняў і аперацый, якія прыводзяць да рашэння тых ці іншых задач. Гэты тэрмін, на першы погляд, вельмі слаба суадносіцца з тэрмінамі «творчасць», «творчыя здольнасці», «развіццё», але гэта толькі на першы погляд. Так, вывучаючы працэс развіцця творчых якасцей асобы ў сферы мастацкай дзейнасці, мы прыйшлі да вываду аб неабходнасці строга рэгламентаваць усю



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

работу па падрыхтоўцы і стварэнню музычнага спектакля, паколькі імправізацыя, інсайт, інтуіцыя могуць праяўляцца толькі ў выніку вялікай падрыхтоўчай работы, якая складае змест тэрміна «алгарытм» у дадзеным кантэксце. Значыць, неабходна рэгламентаваць не сам працэс творчай дзейнасці ў тым ці іншым відзе мастацтва, а ўсю падрыхтоўчую работу, якая папярэджвае стварэнне твора мастацтва, асабліва твора калектыўнага характару (напрыклад, музычнага спектакля). Такім чынам, выкарыстанне алгарытму развіцця творчых якасцей асобы сродкамі мастацтва не толькі не супярэчыць логіцы, але і актывізуе крэатыўнасць, садзейнічае праяўленню і развіццю творчых здольнасцей асобы ў працэсе мастацкай дзейнасці, а таксама дазваляе падняць узровень прыкладных даследаванняў творчасці на больш высокую ступень.

Алгарытм развіцця творчых якасцей асобы сродкамі музычнага тэатра ўключае тры асноўных аспекты: падрыхтоўчы, ствральны і выніковы, якія характарызуюць эксперыментальную тэхналогію кожнага з чатырох этапаў. Адметнай асаблівасцю першага этапу з'яўляецца індывідуальна-групавы характар работы з удзельнікамі па зборы і інтэграцыі ідэй на прапанаваную тэму па наступных накірунках:

а) сюжэтная лінія;

б) вобразны строй;

в) музычнае афармленне;

г) візуальнае рашэнне спетакля;

д) дэкаратыўна-мастацкае афармленне сцэны і распрацоўка эскізаў касцюмаў.

Другі этап — стварэнне з дапамогай спецыялістаў твора вялікай сцэнічнай формы, які ўключае:

а) сцэнарый,

б) музыку,

в) сцэнаграфію,

г) дэкарацыі і касцюмы,

д) рэжысуру.

Трэці этап — засваенне сцэнічнай формы — уяўляе сабой рэпетыцыйную работу дзяцей па групах і агульны мантаж спектакля.

Чацверты этап — выканальніцкае майстэрства школьнікаў у рамках засвоенай формы на падставе імправізацыі, творчай свабоды і асабістай ініцыятывы кожнага ўдзельніка спектакля.

Прапанаваны намі алгарытм развіцця крэатыўнасці падлеткаў складаецца з некалькіх узаемадапаўняючых блокаў. Сярод іх блок «эксперыментальная тэхналогія» займае вядучае палажэнне. Структуру гэтага блока складаюць шэсць паслядоўна ўводзімых звенняў, якія адпавядаюць розным накірункам дзейнасці. Кожнае звяно мае сваю ўнутраную структурную арганізацыю і логіку пабудовы. Назавем іх: уводзіны ў мастацтва музычна-тэатральнага жанру; стымуляванне актыўнасці і творчай ініцыятывы, генерацыя ідэй; узровень арганізацыі рэпетыцыйнай работы; сцэнарна-рэжысёрскае рашэнне і калектыўная творчасць падлеткаў; міжасобасныя адносіны і ўнутрыгрупавыя сувязі; прэм'ерны паказ спектакля.

Такім чынам, тэхналогія творчай дзейнасці асобы па стварэнню музычнага спектакля, аснову якой складае алгарытм развіцця крэатыўнасці падлеткаў, уяўляе многааспектную і рознабаковую з'яву. Сутнасць яе — стымуляванне развіцця творчых якасцей асобы падлеткаў у працэсе стварэння музычнага спектакля; стварэнне аптымальных умоў для найбольш поўнай і ўсебаковай рэалізацыі крэатыўнасці школьнікаў на матэрыяле мастацтва. Эфектыўным сродкам накіраванага развіцця крэатыўнасці падлеткаў выступае музычны тэатр, паколькі ў выніку функцыяніравання падлеткавай рэфлексіі скачкападобна і ў розных накірунках ажыццяўляецца дзейнасць эмацыянальнай сферы (назіраецца не толькі ўскладненне эма-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

цыянальных рэакцый, але і іх скарачэнне), што абумоўлівае неабходнасць пошуку дзейсных сродкаў стабілізацыі і крэатыўнай рэалізацыі асобы. Адным з такіх сродкаў з'яўляецца мастацтва музычнага тэатра, які дазваляе падлеткам выбраць дзейнасць па душы па прычыне сваёй жанравай спецыфікі.

Выкарыстанне тэхналогіі творчай дзейнасці падлеткаў па стварэнню музычнага спектакля, выкладзенай вышэй, дазваляе канстатаваць, што праяўленне і развіццё крэатыўнасці як інтэгратыўнай характарыстыкі асобы падлеткаў вызначаецца не толькі структурай прыродных здольнасцей і характарам індывідуальнага вопыту, але і ў значнай ступені ўзроўнем арганізацыі мастацка-творчай дзейнасці, накіраванасцю крэатыўнасці і матывацыйным дыяпазонам удзелу.

Сярод галоўных умоў, неабходных для паспяховага развіцця крэатыўнасці падлеткаў у працэсе мастацкай дзейнасці, можна адзначыць наступныя:

— магчымасць свабоднага выбару заняткаў у адпаведнасці са здольнасцямі і зацікаўленасцю падлеткаў;

— пастаноўка арыгінальных творчых задач (напрыклад, стварэнне музычнага спектакля), якія патрабуюць пэўнай самастойнасці і ініцыятывы;

— стварэнне творчай атмасферы, станоўчага мікраклімату ў групе і стану эмацыянальнай спагадлівасці, што падуладна педагагічнаму майстэрству кіраўніка;

— прывабліванне да розных відаў мастацтва на любым з трох узроўняў: успрыманне, пазнанне, самастойная творчая дзейнасць — з мэтай развіцця індывідуальнай своеасаблівасці крэатыўнасці кожнага ўдзельніка творчага працэсу;

— выкарыстанне спецыяльнай методыкі, якая базіруецца на найноўшых дасягненнях навуковай думкі.

Такім чынам, культуралагічная падрыхтоўка будучых спецыялістаў галіны культуры і мастацтва, у прыватнасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кіраўнікоў дзіцячых мастацка-творчых калектываў, уключае сістэму тэарэтычных ведаў і практычных навыкаў, накіраваных на развіццё творчых здольнасцей, а таксама на самарэалізацыю, самаразвіццё і самаактуалізацыю кожнай асобы. Неабходнасць вывучэння найноўшых педагагічных тэхналогій і прафесійных методык абумоўлена перш за ўсё кардынальнымі зменамі ў жыцці кожнай асобы і ўсяго грамадства, а таксама новымі патрабаваннямі да прафесійнай кваліфікацыі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй.

**Каралькоў М.А.**, *дацэнт*

## АСНОЎНЫЯ ТЭНДЭНЦЫІ ПАДРЫХТОЎКІ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ МАСТАЦКАЙ ТВОРЧАСЦІ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Факультэт мастацкай творчасці быў створаны ў 1986 годзе на базе былога факультэта культурна-асветніцкай работы. Асноўная мэта адкрыцця факультэта заключалася ў павышэнні якасці падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне мастацкай культуры, забеспячэнні нашай рэспублікі спецыялістамі высокага прафесійнага ўзроўню. Па сутнасці гэта быў пераход да падрыхтоўкі спецыялістаў больш вузкай прафілізацыі, але на значна больш высокім прафесійным узроўні.

Ужо на першым пасяджэнні вучонай рады былі акрэслены асноўныя накірункі дзейнасці і падрыхтоўкі спецыялістаў. Спачатку мы дабіліся ўключэння ў дзяржаўны экзамен ігры на спецінструменце, а потым і прысваення лепшым выпускнікам нашай ВНУ кваліфікацыі выкладчыка спецыяльных дысцыплін.

Доўгі час Міністэрства культуры не давала дазвол на паступленне ў нашу ВНУ абітурыентам, якія скончылі музычныя вучылішчы. Але дзякуючы нашай настойлівасці такі дазвол мы